# Ніжагародскі губернатар падарыў "Жазло праўлення"

У час свайго знаходжання ў Мінску губернатар Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі Валерый Шанцаў падарыў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі па-майстэрску зробленую копію кнігі нашага суайчынніка Сімяона Полацкага "Жазло праўлення". Яна была выдадзена ў Маскве ў 1667 годзе і прысвечана барацьбе з раскольніцтвам.

Выступаючы на ўрачыстасці ў бібліятэцы, губернатар падкрэсліў, што Ніжагародчыну звязваюць з Беларуссю даўнія сувязі. Ураджэнцы апошняй, "літоўскія гарматнікі", дапамагалі ў вызваленні надволжскага горада ад татараў. Шляхціц з Мінскай губерні Ілья Кунцэвіч, працуючы тут земскім урачом, заснаваў на Ніжагародчыне першыя дзіцячыя яслі. У Ніжнім Ноўгарадзе прабывала сям'я Максіма Багдановіча.

Ва ўрачыстасці прыняў удзел міністр культуры Беларусі Леанід Гуляка.

**Тамара ЯФІМАВА.**